Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра гісторыка-культурнай спадчыны

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА | УЗГОДНЕНА |
| Загадчык кафедры | Дэкан факультэта |
| _________________Д. В. Герасімёнак | _____________Ю. М. Галкоўская |
| «____»_____________2022 г. | «_____»__________2022 г. |

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# ГІСТОРЫЯ МУЗЕЙНАЙ СПРАВЫ

для спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Складальнік:
дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны,
кандыдат культуралогіі. І. І. Бамбешка

Разгледжаны і рэкамендаваны
на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 21 чэрвеня 2022 г.
пратакол №12

Складальнік:

Бамбешка І. І., *дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі*

Рэцэнзенты:

Я. Л. Краснова, *вядучы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», кандыдат культуралогіі;*

*Кафедра гісторыі Беларусі і славянскіх народаў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка»*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ЗМЕСТ**


| | |
|---|---|
| 1 ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА | 4 |
| 2 ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ | 6 |
| 2.1 План-канспект лекцый | 6 |
| 3 ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ | 34 |
| 3.1. Тэматыка семінарскіх заняткаў | 34 |
| 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ | 46 |
| 4.1. Заданні для самастойнага вывучэння | 46 |
| 4.2 Тэставыя заданні | 48 |
| 4.3. Пытанні да экзамену | 120 |
| 5 ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ | 122 |
| 5.1 Тэматычны план | 122 |
| 5.2. Асноўная літаратура | 124 |
| 5.3 Дадатковая літаратура | 124 |


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Важнай передумовай паспяховай навуковай і практычнай работы музеязнаўцаў з'яўляецца рацыянальнае разуменне развіцця музея, якое правамерна прызнаць абавязковым кампанентам сучаснай музейнай практыкі з яе праектаваннем у будучыню, паколькі як мінулае, так і сучаснае – неад'емныя складовыя часткі адзінага гістарычнага працэсу. Разгляд гістарычнага вопыту музейнай справы неабходны для тэарэтычнай і практычнай распрацоўкі актуальных пытанняў музеязнаўства.

Натуральна, што зразумець сацыякультурнае значэнне музея ў жыцці чалавецтва магчыма толькі пры ўмове яго вывучэння ў гістарычнай перспектыве і абавязкова ў асобных рэгіёнах свету. У рэшце рэшт, гісторыя музейнай справы з'яўляецца складовай часткай музеязнаўства, побач з тэарэтычным і прыкладным музеязнаўствам, а таксама музейным крыніцазнаўствам. Без вывучэння гісторыі музейнай справы цяжка ўявіць сабе далейшае паспяховае развіццё гэтай галіны навукі.

Гэтыя абставіны робяць дадзеную вучэбную дысцыпліну надзвычай актуальнай у працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя музейнай справы» прызначаны для студэнтаў спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурная спадчыны».

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя музейнай справы» непасрэдна звязана з шэрагам музеязнаўчых («Тэорыя і методыка музейнай справы», «Асновы навукова-фондавай і навукова-даследчай работы музеяў», «Музеі замежных краін», «Музеі Беларусі», «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» і інш.) і агульнагістарычных дысцыплін («Усеагульная гісторыя» і «Гісторыя Беларусі»), а таксама такімі дысцыплінамі, як філасофія, тэорыя і гісторыя культуры, усеагульная гісторыя мастацтваў і іншымі.

Мэтай выкладання дадзенай вучэбнай дысцыліны з'яўляецца вывучэнне студэнтамі пытанняў ўзнікнення і развіцця музейнай ідэі і яе ўвасаблення ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перадмузейных зборах і музеях, музейнай сеткі, арганізацыі музейнай справы, музейнага заканадаўства, музеязнаўства як навукі, музейнай практыкі на розных гістарычных этапах.

Мэтавая накіраванаць вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя музейнай справы» прадугледжвае вырашэнне шэрага задач:

- разгляд асаблівасцей вывучэння крыніц і гістарыяграфіі гісторыі музейнай справы на розных гістарычных этапах;
- выяўленне сацыяльных і культурных перадумоў для стварэння збораў музейных прадметаў;
- асвятленне сацыяльных і культурных умоў стварэння калекцый музейных прадметаў і саміх музеяў;
- раскрыццё зместу асноўных этапаў станаўлення і развіцця калекцый музейных прадметаў і саміх музеяў у розных краінах у сувязі з сацыяльным і культурным развіццём чалавецтва;
- тлумачэнне асноўных заканамернасцей і пераемнасці развіцця музейнай справы ў розных рэгіёнах свету;
- вывучэнне фарміравання кола праблем, якія атрымалі адлюстраванне ў калекцыях і музеях;
- высвятленне таго, інтарэсы якіх сацыяльных груп адлюстроўвалі гэтыя калекцыі і музеі;
- даследаванне дзейнасці музеязнаўчых устаноў і арганізацый, падрыхтоўкі музейных кадраў, выдавецкай дзейнасці па музейнай праблематыцы.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя музейнай справы» студэнт павінен *ведаць:*

- асноўныя этапы развіцця музейнай справы буйнейшых краін свету;
- гісторыю развіцця музейнай справы ў Беларусі;
- асноўныя паняцці тэорыі і методыкі гісторыі музейнай справы;
- ролю музеяў у развіцці культуры чалавецтва;

*умець:*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- выкарыстоўваць асноўныя паняцці, законы і фактычны матэрыял па гісторыі музейнай справы ў тэарэтычнай, метадычнай і практычнай музейнай дзейнасці;
- аналізаваць крыніцы па гісторыі музейнай справы Беларусі;
- даць характарыстыку гісторыі музейных устаноў, фарміравання музейнага фонда буйнейшых краін свету;
- аналізаваць вопыт музейнага будаўніцтва ў асобных рэгіёнах і краінах;
- вызначаць месца і ролю музеяў Беларусі ў развіцці сусветнай культуры.

Студэнты *павінны валодаць:*

- асноўнымі метадамі гісторыка-музейных даследаванняў;
- гістарыяграфіяй, крыніцазнаўствам і метадычнымі прыёмамі вывучэння гісторыі музейнай справы.

Акрамя таго, студэнты павінны навучыцца аналізаваць гістарычныя ўмовы развіцця музеяў і музейнай справы, ацэньваць дзеянні і выказванні калекцыянераў і музейных дзеячоў як з улікам сённешняга стану музейнай думкі, так і з пункту гледжання ідэй, адпаведных падзеям эпохі, аналізаваць інфармацыйныя крыніцы і аргументаваць уласны пункт гледжання.

Дадзены вучэбна-метадычны комплекс арыентаваны перш за ўсё на вывучэнне агульных пытанняў гісторыі музейнай справы. Асаблівая ўвага пры гэтым надаецца беларускаму матэрыялу. Імкненне да абагульненасці акрэсліла агульную структуру праграмы. Увесь матэрыял згрупаваны па тэмах, якія храналагічна супадаюць з традыцыйным падзелам гістарычнага працэсу.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Гісторыя музейнай справы» прадугледжана 138 гадзін, з іх 76 – аўдыторых. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 50 гадзін, семінарскія заняткі – 26 гадзіны. Рэкамендаваныя формы кантролю – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 План-канспект лекцый

### *Уводзіны*

Месца вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя музейнай справы» ў сістэме гуманітарнай адукацыі. Месца вучэбнай дысцыпліны а ў сістэме музеялагічных дысцыплін. Гісторыя музейнай справы як базавай дысціпліны па спецыяльнасці «музейная справа і ахова гісторыка-культурная спадчыны». Сувязь вучэбнай дысцыпліны «гісторыя музейнай справы» з вучэбнымі дысцыплінамі па айчыннай і сусветнай гісторыі і культуры.

Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны. Прадмет вучэбнай дысцыпліны. Структура вучэбнай дысцыпліны. Формы кантролю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел I. Агульныя тэарэтыка-метадычныя пытанні гісторыі музейнай справы

### *Тэма 1. Тэарэтычныя аспекты гісторыі музейнай справы*

Сучасны чалавек існуе ў асяроддзі натуральных, зменены і створаных ім самім матэрыяльных прадметаў. Інтэнсіфікацыя развіцця ведаў як асноўнага фактара развіцця цывілізацыі вымушае грамадства захоўваць падобныя прадметы, якія страчваюць сваё ўтылітарнае значэнне як рэальныя прыкметы былой культуры і што звязваюць нас з продкамі. Для захавання, даследавання і прадстаўлення такіх прадметаў і ствараюцца музеі.

Першапачаткова музей абмяжоўваўся захаваннем, даследаваннем і прадстаўленнем цікавых з пункту гледжання культуры і навукі рэчаў прыроднага і штучнага паходжання. Паступова ён набыў больш шырокія сацыяльныя функцыі.

Важнай перадумовай паспяховай навуковай і практычнай работы музеязнаўцаў з’яўляецца рацыянальнае разуменне развіцця музея, якое правамерна прызнаць абавязковым кампанентам сучаснай музеязнаўчай работы

з яе праецыраваннем на будучыню, паколькі як мінулае, так і сённешняе – неад'емныя часткі адзінага гістарычнага працэсу.

Таму рагляд гістарычнага вопыту музейнай справы неабходны для навуковай і практычнай распрацоўкі актуальных пытанняў музеязнаўства. Так, пад час складання тэматыка-экспазіцыйнага плана музея прыходзіцца ўлічваць і папярэдні вопыт, і сучасныя для складальніка ўмовы, і папярэднюю яго рэалізацыю

Бяспрэчна і тое, што зразумець сацыякультурнае значэнне музея ў жыцці чалавецтва магчыма пры ўмове яго вывучэння ў гістарычнай перспектве і абавязкова ў асобных рэгіёнах свету. Зневажэнне гістарычнай сувяззю падзей, з'яў і фактаў непазбежна прыводзіць да тэарэтычных і практычных памылак ў любым даследаванні і ў прыватнасці ў музеязнаўстве.

Крытычнае асвятленне мінулага гісторыі музейнай справы дапамагае лепш асэсаваць сённешняе, выкарыстоўваючы ўсё назапашанае раней як дасягненні, так і няўдачы, а таксама іх прычыны.

Гісторыя музейнай справы вылучаецца у асобную навуковую дысцыпліну і з'яўляеццца часткай музеязнаўства. Паняцце «гісторыя музейнай справы» шматзначна Гісторыя музейнай справы разглядаецца як навуковая і вучэбная дысцыпліна, якая вывучае пытанні ўзнікнення і развіцця музейнай канцэпцыі (ці ідэі) і яе ўвасаблення ў перадмузейных зборах і музеях, музейнай сеткі, арганізацыі музейнай справы, музейнага заканадаўства, музеязнаўства, музейнай практыкі, музейнай архітэктуры на розных гістарычных этапах.

Аб'ект вывучэння гісторыі музейнай справы – сукупнасць элементаў музейнай справы, пачынаючы з практыкі збіральніцтва прадметаў музейнага значэння ў іх часовым і прасторавым развіцці, іх узнікненне і функцыянаванне ў якасці гісторыка-культурнага і гісторыка-сацыяльнага фенамена. У той жа час пералічаны элементы могуць вывучацца і іншымі навукамі (гісторыяй, гісторыяй культуры, гісторыяй мастацтва і інш.). Аднак падыходы да акрэсленага аб'екта адрозніваюцца. Гэта азначае, што навукі адрозніваюцца па прадмету даследавання. Можна вызначыць прадмет гісторыі музейнай справы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

як кола аб’ектыўных заканамернасцей паходжання грамадскіх інстытутаў, якія закліканы задавальняць названую патрэбу, іх функцыянаванне ў розных гістарычных умовах, фарміраванне музейнай сеткі, арганізацыя музейнай справы, а таксама гісторыя музейнага заканадаўства.

Гісторыя музейнай справы вывучае мінулае той ці іншай галіны культуры, якая аб’дноўвае музейнае будаўніцтва і закаданаўства, якая мае дачыненне да музеяў і аховы помнікаў, кіравання музеямі, музеязнаўства, а таксама гісторыю музейнай практыкі (навукова-фондавай, навукова-экспазіцыйнай і навукова-рэпрэзентацыйнай работы).

Прадмет гісторыі культуры, складовай часткай якой з’яўляецца гісторыя музейнай справы, значна больш шырокі, чым прадмет гісторыі музенай справы.

Прадмет гісторыі музейнай справы сутыкаецца і з прадметам гісторыі тых галін ведаў, з якіх у музейную практыку ўключаюцца прадметы музейнага значэння, – гісторыя мастацтва, прыродазнаўства, фундаментальных, тэхнічных, гуманітарных навуковых дысцыплін. Аднак і прадмет гісторыі кожнай з гэтых дысцыплін адрозніваецца ад прадмета гісторыі музейнай справы таксама як падобныя дысцыпліны развіваліся не толькі ў музеях, але і ў іншых установах.

Праблематыка гісторыі музнейнай справы вызначаецца мноствам як знешніх (культурных, эканамічных, грамадска-палітычных), так і ўнутраных (узровень развіцця ведаў у галіне гісторыі музейнай справы) умоў. Важным аспектам гісторыі музейнай справы як навуковай і вучэбнай дысцыпліны з’яўляецца метад як спосаб пазнання, сістэма прыёмаў даследавання розных бакоў вывучаемых з’яў. Сярод асноўных метаў гісторыі музейнай справы – гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, тыпалагічны і гісторыка-сістэмны.

Гісторыка-генетычны метад вывучае змены і рух з'яў, фіксуючы пры гэтым межы даследуемай рэальнасці. Ён накіраваны на аналіз развіцця і павінен арганічна ўключаць характарыстыку агульнага і асаблівага. Гэты метад ў

значнай ступені характарызуецца апісальнасцю, фактаграфічнасцю і эмпірызмам.

Гісторыка-параўнальны метад дазваляе выявіць з дапамогай параўнання гістарычных падзей агульнае і асаблівае. Параўнанне з'яўляецца важным і найбольш распаўсюджаным метадам навуковага пазнання. Аб’ектыўнай асновай для параўнання служыць тое, што гістарычнае развіццё грамадства мае паўтараемы і ўнутрана абумоўлены характар. Многія грамадскія з'явы па сваёй унутранай сутнасці падобныя і адрозніваюцца толькі прасторавай і часовай варыяцыяй формаў. Падобныя формы могуць мець розны змест. Метад параўнання дазваляе растлумачыць разглядаемыя з'явы і раскрыць іх сутнасць. У яго аснове ляжыць аналогія – агульнанавуковы метад пазнання, сутнасць якога ў тым, што на аснове падобных прыкмет параўноўваемых аб'ектаў робіцца заключэнне пра падабенства іншых прыкмет.

Тыпалагічны метад заснаваны на падзеле аб’ектаў і з’яў на пэўныя групы з дапамогай абагульненай мадэлі і тыпу па характэрным, істотным для іх прыкметам. Тыпалогія як метад навуковага пазнання выкарыстоўваецца з мэтай параўнальнага вывучэння істотных прыкмет, сувязяў, адносін, функцый, узроўняў арганізацыі аб'ектаў і інш. Асноўнымі лагічнымі формамі тыпалогіі з’яўляюцца тып (напрыклад, музейнага аб’екта, які валодае істотнымі якаснымі прыкметамі), класіфікацыя (сістэма падпарадкаванасці паняццяў, якая выкарыстоўваецца як сродак для ўстанаўлення сувязяў паміж гэтымі паняццямі), супастаўленне (вызначэнне шляхам параўнання спецыфічных асаблівасцяў з'яў, высвятленне іх агульных уласцівасцяў).

Гісторыка-сістэмны метад разглядае функцыянаванне і развіццё гістарычных сістэм рознага ўзроўню ў выглядзе індывідуальных падзей, фактаў і сітуацый. Апошнія разглядаюцца не толькі як прычынна-абумоўленыя, але і як функцыянальна-звязаныя.

Музей – дастаткова складаны па сваёй сутнасці сацыяльны арганізм і прапанаваць яго вызначэнне не проста. Паняцце «музей» увялі ў культуры ўжытак чалавецтва старажытныя грэкі, аднак у антычным свеце яно ніколі не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўжывалася ў адносінах да збору прадметаў. Старажытнагрэчаскае слова «мусейён» літаральна азначае – «месца, прысвечанае музам», гэта значыць свяцілішча музаў. Шэраг даследчыкаў выводзяць паходжанне музея ад Александрыйскага Мусейона, які выконваў функцыі сучаснай акадэміі навук. У імператарскім Рыме Мусейонам называли месца, дзе праводзіліся філасофскія дыскусіі. У перыяд Сярэднявечча гэты тэрмін быў забыты і зноў уведзены ва ўжытак толькі ў XV ст. у Фларэнцыі для абазначэння калекцыі Ларэнца Медычы. У XVII ст. словам музеорозум называлі калекцыі рэдкасцяў і толькі ў эпоху Асветы словам музеум сталі называць установы для захоўвання і дэманстрацыі публіцы коллекцый помнікаў гісторыі і прыроды. Праўда, у XVIII-XIX стст. пад словам музей» разумеўся хутчэй будынак ці месца, дзе захоўваліся і дэманстраваліся калекцыі, чым самі калекцыі. У наш час, асабліва пасля з’яўлення музеяў пад адкрытым небам і экамузеяў, пад музеямі сталі разумець не толькі будынкі, але і сукупнасць помнікаў, якія належаць музею, але не абавязкова захоўваюцца ў яго сценах. Сучасная еўрапейская традыцыя адносіць да музеяў мастацкія галерэі незалежна ад зместу іх калекцый і формаў кіравання, а амерыканская, акрамя таго, – заапаркі, батанічныя сады, а таксама акварыумы.

У гістарычнай літаратуры можна сустрэць і іншыя тэрміны, якія выкрыстоўваліся для абазначэння таго, што сёння называецца музеем. Італьянскае слова «galleria» ўжывалася з XVI ст. для вызначэння доўгага вузкага пакоя, дзе экспанаваўся жывапіс і скульптура. Нямецкая культурная традыцыя ўзбагаціла музейную тэрміналогію многімі тэрмінамі, у прыватнасці кунсткамера (ад ням. kunstkammer – кабінет мастацтва), wunderkammer – сховішча прадметаў натуральнай гісторыі, rustkammer сховішча гістарычных помнікаў ці зброі. Тэрмін «пінакатэка» (ад pinax – дошка, карціна і theke – сховішча) бярэ свой пачатак у Афінах у V ст. да н. э., дзе ім абазначалі мастацкія галерэі. Гэты тэрмін мы можам сустрэць і сёння ў назвах некаторых сучасных мастацкіх музеяў (Старая і Новая Пінакатэкі ў Мюнхене). Нарматыўнае вызначэнне музея было прынята на XI-й Генеральнай Асамблеі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міжнароднага савета музеяў у Гаазе ў 1989 г .: «Музей – гэта некамерцыйнае пастаянна дзеючае ўстанова, якая служыць грамадству ў мэтах яго развіцця. Адкрыты для публікі, музей набывае, захоўвае, даследуе, папулярызуе і экспануе матэрыяльныя сведчанні аб жыцці чалавека і навакольнага асяроддзя ў навуковых, адукацыйных і рэкрэацыйных мэтах».

Асэсаванню працэсу гісторыі музейнай справы, аблягчэнню выяўлення ўнутраных заканамернасцей і магчымасцей навуковага абагульнення дамагае яго перыядызацыя. Перыядызацыяй прынята называць падзел гістарычнага часу ў адпаведнасці з якасным развіццём працэсаў, якія ў ім адбываліся. Гэта істотнае размеркаванне гісторыка-музейнага працэсу пэўнага этнасу, краіны, рэгіёна, кантынента, чалавецтва.

Для таго, каб выпрацаваць перыядызацыю вывучаемага ў даследаванні любога раздзела гістарычнай навукі, у тым ліку і ў гісторыі музейнай справы, першапачаткова неабходна вырашыць, што пакласці ў яе аснову, гэта значыць неабходна вызначыць крытэрый падзелу гістарычнага працэсу на асобныя этапы.

У савецкай і айчыннай гістарыяграфічнай традыцыі ХХ ст. пераважаў фармацыйны падыход да перыядызацыі. Для яго галоўным крытэрыем развіцця грамадства з'яўлялася матэрыяльная вытворчасць, эканамічныя адносіны і класавая барацьба. Адмаўляць уплыў на гістарычны працэс з боку матэрыяльнай вытворчасці і эканамічных адносін было б няправільна Аднак пры гэтым нельга недаацэньваць значэнне духоўных фактараў для развіцця чалавецтва.

У сучаснай гістарычнай навуцы пры пабудове схем перыядызацыі часта звяртаюцца да комплекснага гісторыка-культурнага ці цывілізацыйнага падыходу. Пры такім падыходзе паўней ахопліваецца сукупнасць прыродных, эканамічных, палітычных, маральных і духоўных фактараў, якія ўплываюць на дзейнасць людзей.

Савецкія гісторыкі музейнай справы і іх калегі з ГДР, напрыклад К. Шрайнер (1983, 1986), прытрымліваліся ў сваіх даследаваннях фармацыйнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перыядызацыі, вылучаючы перыяды першабытны, рабаўласніцкі, феадальны, капіталістычны і сацыялістычны.

А. Уітлін (1970) падзяліла гісторыю музейнай справы на перыяды: падрыхтоўкі публічных музеяў, ранніх публічных музеяў, спроб рэформы музеяў (з 1851 па 1914 год), развіцця музеяў паміж першай і другой сусветнымі войнамі і развіцця музеяў пасля другой сусветнай вайны.

Ю. дэ Варын-Боан (1950) падзяліў развіццё музейнай справы ў адпаведнасці з агульнагістарычнай перыядызацыі гісторыі замежных краін. Гэты перыяды гісторыі сярэднявяковых музеяў, музеяў перыяду Адраджэння па 1700 г., музеяў XVIII ст., музеяў у 1790-1850 гг., музеяў у 1850-1950 гады і музеяў 1950-1970-х гг.

У працы «Музеі свету. Уводзіны ў музейную справу» (1982) З. Жыгульскі малодшы вызначае наступныя перыяды ў гісторыі музейнай справы: старажытнасць Еўропы і Блізкага Усходу, еўрапейскае сярэднявечча, Рэнесанс, маньрызм і барока ў Еўропе, протамузейныя з'явы ў некаторых краінах Азіі і дакалумбавай Амерыкі, затым XVIII ст., XIX ст. ст. і першая палова XX ст.

Дж. Льюіс (1984) прапанаваў своеасаблівую перыядызацыю, у аснове якой ляжыць працэс пераходу ад працэсу калекцыяніравання да стварэння ўласна музеяў: класічнае калекцыяніраванне, ранняе калекцыяніраванне ў краінах Азіі, калекцыяніраванне ў сярэднявяковай Еўропе, калекцыяніраванне ў перыяды Адраджэння і Асветы, перыяд ранніх публічных музеяў (з XVI ст.). у Еўропе і за яе межамі, перыяд развіцця музеяў у XX ст. Некалькі пазней (1993) Дж. Льюіс, захоўваючы той жа прынцып перыядызацыі гісторыі, звярнуўся да некалькі іншай паслядоўнасці і іншых фармуліроўкам: перыяд папярэдніх музеям з'яў, якія ўключаюць у сябе класічнае калекцыяніраванне, калекцыі Адраджэння, каралеўскія калекцыі, спецыялізаваныя асабістыя калекцыі і калекцыі навуковых таварыстваў, перыядддд узнікнення музеяў, які ўключае ў сябе этапы публічных калекцый (з пачатку XVI ст.), першых публічных музеяў (з канца XVI ст.), перыяд музеяў у час нацыянальнай ідэнтыфікацыі (першая палова XIX ст.), сярэдзіну XIX ст., першый музейны бум другой паловы XIX



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ст., этап пераацэнкі ролі музеяў у жыцці грамадства (першая палова XX ст.) і этап новага развіцця і новай ролі музеяў пасля II сусветнай вайны.

Як бачна, былі прапанаваны розныя прынцыпы перыядызацыі гісторыі музейнай справы, якія маюць рознае абгрунтаванне. Агульны падыход да перыядызацыі гісторыі музейнай справы пакуль адсутнічае.

Больш правамерна пры перыядызацыі гісторыі музейнай справы зыходзіць як са спецыфікі самога яго развіцця, так і з улікам змен у сацыяльным і культурным жыцці грамадства. У дадзеным выпадку вызначаюцца наступныя перыяды, якія адпавядаюць развіццю музейнай справы ў сукупнасці краін і мацерыкоў у цэлым:

1. Перадмузейнае збіральніцтва ў першабытным грамадстве, старажытным свеце і сярэднявеччы;
2. Узнікненне музея як сацыяльнага інстытута (XV ст. – канец XVI ст.);
3. Фарміраванне музея як сацыяльнага інстытута (XVII – канец XVIII ст.);
4. Музейная палітыка і музейная справа ў перыяд буржуазных рэвалюцый канца XVIII – першай паловы XIX ст., з’яўленне публічных музеяў як вынік рэалізацыі сацыяльных патрабаванняў масс;
5. Пашырэнне музейнай сеткі і ўзмацненне спецыялізацыі музеяў у другой палове XIX – пачатку XX ст.
6. Музейная палітыка і музейная справа паміж двума сусветнымі войнамі.

Унутры кожнага этапу можна вылучыць асобныя перыяды развіцця музейнай справы.

### *Тэма 2. Гістарыяграфія гісторыі музейнай справы*

Характарыстыка, аб’ект, прадмет і задачы гістарыяграфіі гісторыі музейнай справы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Першыя спробы разгляду этапаў развіцця музеяў у даследаваннях К. Ф. Енкеля (вядомага пад псеўданінам Найкель) і І. Канольда (1727), К. Ф. Бёцігера (1808). Агляд дзейнасці асобных музеяў у працах Л. фон Ледэбура (1831), Г. Ф. Клема (1837), Э. Банафе (1867), Э. Р. Курцыуса (1870) і інш. Першыя абагульняючыя даследаванні па ўсеагульнай гісторыі музейнай справы Д. Мары (1904) і яго канцэпцыя аб залежнасці развіцця музеяў ад узроўня культуры грамадства. Работы па гісторыі музейнай справы ў асобных краінах свету. Ю. фон Шлосер (1908), В. Шэрэр (1913).

Гісторыя калекцыяніравання ў працах Э. Ф. Тэйлара (1947), Н. фон Хольста (1960), Ж. Базэна (1967), Х. Закс (1971). Даследаванні А. С. Уітлін (1949, 1970) аб агульных тэндэнцыях развіцця музейнай справы ў свеце. Спробы абагульнення гісторыі развіцця спецыялізаваных музеяў Ф. Клема (1973), Ж. Базэна (1979, 1983) і інш. Праблемы гісторыі музеяў і пытанні рэфармавання музейнай справы ў другой палове XX ст. у даследаваннях Э. П. Александэра (1979, 1983), З. Жыгульскага Малодшага (1982), К. Шрайнера (1983-1986), Дж. Льюіса (1984), К. Хадсана (1987) і інш.

Асвятленне гісторыі развіцця асобных музеяў Расіі ў другой палове XVIII ст. Выданне нарысаў аб узнікненні і дзейнасці музеяў, падрыхтаваных ініцыятарамі іх іх стварэння (А. І. Кытманаў, М. І. Палікарпаў і інш.), гісторыі асобных музееяў (І. Я. Забелін і інш.) і груп музеяў (музеяў АН, земскіх музеяў і інш.). Даследаванне У. С. Іконнікава «Вопыт рускай гістарыяграфіі» ў фарміраванні гісторыі музейнай справы (1891-1908). Працы Ф. І. Шміта (1919, 1929), Г. Л. Маліцкага і інш.

Выданне «Нарысаў гісторыі музейнай справы ў СССР і Расіі» калектывам гісторыкаў пад кіраўніцтвам А. М. Разгона (1957-1971). Даследаванні гісторыі развіцця музейнай справы ў рэспубліках СССР. Працы Г. Р. Мезенцавай (1959), Н. С. Садыкавай (1975) і інш. Выданне дапаможнікаў па гісторыі музейнай справы ў Расіі Л. В. Чыжовай (1991), А. І. Фралова (1991), С. А. Каспарынскай (1992), В. П. Грыцкевіча (2002, 2003, 2007) і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Распрацоўка пытанняў гісторыі музейнай справы ў Беларусі. Працы Б. Р. Брэжга (1926), Г. А. Каханоўскага (1984), Л. В. Аляксеева (1996), А. А. Гужалоўскага (2001, 2002, 2004, 2013) і інш.

### *Тэма 3. Крыніцазнаўства гісторыі музейнай справы*

Зыходзячы з вопыту, назапашанага тэорыяй і практыкай агульнагістарычным крыніцазнаўства, крыніцазнаўствам гісторыі музеяў можна назваць раздзел гістарычнай музеялогіі (і адначасова агульнагістарычным крыніцазнаўства), які даследуе крыніцы па гісторыі музеяў і спосабы іх вывучэння. Крыніцамі па гісторыі музеяў з'яўляюцца матэрыяльныя аб'екты, якія створаны, апрацаваны і ў шэрагу выпадкаў вывучаны, адлюстроўваюць развіццё музейнай дзейнасці і выкарыстоўваюцца на практыцы гісторыкамі з мэтай асвятлення гэтай сферы культуры ў мінулым. Крыніцы па гісторыі музеяў адрозніваюцца ад даследаванняў па гісторыі музеяў, якія ствараюцца свядома на базе вывучэння крыніц са спецыяльнай мэтай і маюць характар абагульнення. Аб'ектам крыніцазнаўства па гісторыі музеяў з'яўляюцца крыніцы па гісторыі гэтага сацыяльнага інстытуту, а прадметам – асноўныя заканамернасці ўзнікнення гэтых крыніц і функцыянавання іх у якасці транслятара сацыяльна-гістарычнай інфармацыі. У задачы крыніцазнаўства гісторыі музеяў ўваходзяць пошук, адбор, групоўка крыніц і выманне з іх інфармацыі аб працэсе развіцціця музеяў.

Пры вывучэнні гісторыі музеяў даследчыкі звычайна размяркоўваюць крыніцы па розных групах. Згодна з найбольш распаўсюджанай класіфікацыі яны дзеляцца на пісьмовыя, рэчавыя, выяўленчыя і кіна-, фота-, фонакрыніцы.. З пералічаных крыніц варта вылучыць пісьмовыя, паколькі яны захоўваюць інфармацыю, выкладзеную на натуральнай мове. Пісьмовыя крыніцы ў сваю чаргу дзеляцца на дакументальныя і апавядальныя.

Да дакументальных крыніц адносяцца:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- *Актавыя* (юрыдычныя і нарматыўныя акты, якія характарызуюць стварэнне і функцыянаванне музеяў і вызначаюць характар іх узаемаадносін з уладамі, грамадствам і т. д.) крыніцы.
- *Заканадаўчыя* (законы і пастановы ўраду, якія рэгламентуюць дзейнасць музеяў)
- *Статыстычныя* (статыстычныя звесткі аб колькасці музеяў, аб іх бюджэце, штаце, складзе, фондах, колькасці наведвальнікаў і інш.);
- *Справаводчыя* (спісы маёмасці, справаздачы, фармуляры, анкеты, дакументы ўліку, пашпарты музейных прадметаў, пратаколы нарад і інш.);

Да апавядальных крыніц адносяцца:

- *Летапісы і хронікі (*хранікальныя запісы аб дзейнасці музеяў, складзеныя ўдзельнікамі падзей);
- *Мемуары і эпісталярныя крыніцы (*лісты, дзённікі, успаміны асобных дзеячаў аб музеях, прыватныя паперы музейных супрацоўнікаў і інш.);
- *Літаратурныя і публіцыстычныя (*адлюстроўваюць погляды грамадства і яго асобных прадстаўнікоў на ролю музеяў, калекцыянераў, музейных дзеячоў у жыцці грамадства, праламленне ў свядомасці аўтараў літаратурных і публіцыстычных твораў).

Асобную катэгорыю крыніц складаюць *картаграфічныя крыніцы* (планы і схемы музеяў, схемы гарадоў з указаннем месцазнаходжання музеяў і інш.) і *перыядычны друк*, у якім утрымліваецца інфармацыя рознага кшталту.

Прыведзеная класіфікацыя крыніц дазваляе падзяляць іх па ўнутраных, сутнасных прыкметах. Акрамя таго, існуе класіфікацыя крыніц і па знешніх прыкметах – даволі зручная ў практычнай рабоце. Прывядзём класіфікацыю друкаваных крыніц, прапанаваную Дакументацыйным цэнтрам ЮНЕСКА-ІКОМ ў Парыжы:

- *Працягваючыяся перыядычныя і неперыядычныя выданні;*
- *Справаздачы і матэрыялы камісій;*
- *Каталогі;*
- *Бібліяграфічныя агляды.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Перыядычныя і неперыядычныя выданні* складаюць найбольш значную групу па колькасці назваў і аб'ёму і даюць найбольш аператыўную інфармацыю аб дзейнасці музеяў. *Справаздачы і матэрыялы камісій* даюць найбольш каштоўную інфармацыю аб канкрэтнай дзейнасці музеяў: пад-робный аналіз бюджэтаў, складу фондаў, штатаў музеяў і т. д. Гэтыя выданні маюць невялікі тыраж і абмежаванае распаўсюджванне. Крыніцамі па-карыснай інфармацыі аб дзейнасці музеяў з'яўляюцца матэрыялы міжнарод-ных і нацыянальных музейных канферэнцый. *Каталогі і агляды калекцый* і экспазіцый даюць нагляднае ўяўленне аб канкрэтных напрамках работы музеяў.

## Раздзел ІІ. Гісторыя музейнай справы

### *Тэма 4. Дамузейнае збіральніцтва ў старажытным свеце і сярэднявеччы*

Збіральніцтва рэчаў у старажытным свеце. Класіфікацыя дамузейных збораў А. Уітлін. Зборы эканамічнага значэння. Зборы сацыяльнага прэстыжу. Магічныя і іншыя рытуальныя зборы. Зборы як сродак выяўлення групавой прыналежнасці. Зборы як сродак стымуляцыі цікавасці да навакольнага свету і даследавання. Зборы як сродак эмацыянальнага перажывання.

Слова «музей» паходзіць ад грэч. «museion» – месца, прысвечаннае музам, гэта значыць свяцілішча муз, якое даволі часта выглядала як порцік з ахвярнікам ўцэнтры. Там канцэнтраваліся розныя прадметы, якія прыносіліся боствам у якасці ахвяр (творы мастацтва, скульптуры і інш.). Часта музейоны станавіліся цэнтрам свайго роду літаратурных таварыстваў, служылі месцам не толькі пакланення музеям, але і правядзеня творчых спаборніцтваў, прысвечаных музам. Гэтыя святы і называліся – Мусеі. Падобнымі спаборніцтвамі было вядома Феспійскае (Геліконскае), а таксама Дэльфійскае свяцілішчы музаў. Апісанне Дэльфійскага свяцілішча музаў прадстаўлена ў рабоце старажытнагрэчасга аўтара Паўсанія «Апісанне Элады».

Усе рэчы, якія захоўваліся ў храмах, уяўлялі сабою ватыўныя прадметы, якія, у адпаведнасці з рэлігійнай традыцыяй, прыносіліся багам па зароку, з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нагоды перамогі над ворагам, з надзеяй палепшыць здароўе ці задаволіць якую-небудзь просьбу. За захаванне гэтых прадметаў адказвалі спецыяльныя служкі, якія вялі і іх улік. Яны складалі вельмі падрабязныя спісы, дзе пазначалася назва прадмета, матэрыял, асобыя пракметы, захаванасць, імя бога, якому прысвечана, калі і чаму прысвечаны, хто падараваў.

Перыядычна, каб пазбавіцца ад пашкоджаных прадметаў і вызваліць месца для новых складаліся спісы аб спісанні з храма, якія зацвярджаліся саветам храма. Знішчаць што-небудзь незваротна забаранялася. Вырабы з золата і срэбра, якія не валодалі мастацкай каштоўнасцю, пераплаўляліся ў зліткі. Тыя, што не валодалі матэрыяльнай каштоўнасцю закопвалі ў спецыяльныя рэзервуары ці падземныя сховішчы (пры раскопках на поўдні Італіі свяцілішча багіні Геры было выяўлена 30 тысяч ватыўных прадметаў, якія даюць уяўленні аб маштабах храмавых збораў).

Старажытнагрэчаскі жывапіс захоўваўся у <u>*пінакатэках*</u> (ад двух грэчаскіх слоў: πίναξ – дошка, карціна і θήκη –сховішча). Самая знакамітая Пінакатэка грэчаскага свету знаходзілася на Афінскім Акропалі. У 437-432 гг. да н. э. архітэктр Мнесікл пабудаў манументальны ўваход на Акропаль. У паўночным крыле, больш масійным, чым паўднёвым, з глухімі сценамі і размяшчалася Пінакатэка. Паўсаній у сваім творы таксама апісвае змест збору Пінакатэкі.

Для размяшчэнне жывапісу і скульптуры выкарыстоўваліся і спецыяльныя галерэі-портыкі – <u>*стоі*</u>, якія ўяўлялі сабою доўгія галерэі-портыкі, адзін з бакоў якіх уяўляў глухую сцену, а другі – адкрыты фасад з каланадаў, што выходзіла на плошчу. Самай знакамітай з падобных збудаванняў была Стоя Пайкіле, якая размяшчалася па ўсяму перыяметру афінскай Агоры і з'яўлялася любімым месцам адпачынку афінян. Тут знаходзіліся карціны вялікіх памераў на міфічныя і гістарычныя сюжэты, на подыумах размяшчаліся ваенныя трафесіі. Пад час алімпійскіх гульняў выстаўляліся скульптуры атлетаў і знакамітых дзеячаў гісторыі.

Першыя старажытнагрэчаскія калекцыі фарміраваліся ў значнай ступені стыхійна, насілі ў асноўным сакральны характар, з'яўляліся агульным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

набыткам грамадзян і таму па сваёй прыродзе характарызаваліся неаднародным складам. На гэтым фоне выключны характра мела дзейнасць Арыстоцеля, які пры падтрымцы свайго выхаванца Аляксандра Македонскага ён сабраў ў Лікеі заалагічныя і батанічныя прадметы, якія ляглі ў аснову яго біялагічнага калекцыі.

Эпоха эллінізму пашырыла геаграфічныя рамкі старажытнага грэчыскага свету, а таксама культурныя дасягненні. На змену калектывізму прыходзіць індывідуалізм. Ствараюцца Мусейоны, якія спалучаюць у сябе функцыі музея, бібліятэкі, архіва. Спачатку функцыі сумяшчаліся, а затым падзяляліся. Бібліятэка і архіў займаліся зборам пісьмовых крыніц, а музей – гістарычных каштоўнасцей.

Адзін з першых эліністычных музейонаў быў Александрыйскі (Егіпет) – заснаваны царом Пталемеем I Соцерам у 280 г. да н. д. па ініцыятыве Д. Фалерскага. Александрыйскі Мусейон быў часткай комплексу пабудоў у царскім квартале Брухейон. Мусейон планаваўся як цэнтр філасофскіх і навуковых даследаванняў. У склад комплексу уваходзілі ўласна мусейон як свяцілішча музаў, пакоі для пражывання пансіянераў, залы, дзе змяшчаліся сталовая для вучоных, экседра, ці крытая галерэя для чытання лекцый і сумесных заняткаў, «месца для прагулак». Таксама ў складзе мусейона былі калекцыі раслін і жывет у садах, залы для прэпарыравання трупаў і абсерваторыя (знаходзілася ў пачатковым стане). Апошнія тры з’явіліся паступова. Таксама ў складзе Мусеона дзейнічала і Александрыйская бібліятэка.

Мусейоны ствараліся і ў другіх гарадах (Пергаме, Антыахіі-на-Аронце і інш.).

Передмузейнае збіральніцтва ў Старажытным Рыме. З’яўленне першых прыватных калекцый (галерэі Гая Вераса, Л. К. Сулы, Цыцэрона, імператараў Юлія Цэзара, Аўгуста, Нерона і Адрыяна і інш.). Спосабы папаўнення калекцый. Грамадскія зборы. Форум (храм) Міру. Портык Метэла. Помнікі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асінія Паліёна. Захаванне, экспанаванне і паказ грамадскіх збораў у Старажытным Рыме.

Выданне вопісаў калекцый і каталогаў. Антычныя дамузейныя зборы і публіка.

Дамузейнае збіральніцтва ў раннім сярэднявеччы. Уплыў ідэалогіі сярэднявечча на адносіны да калекцыяніравання і яго характар. Храмы і іх скарбніцы. Свецкае калекцыяніраванне. Заснаванне дзяржаўных скарбніц. Старажытнабеларускае збіральніцтва. Княжацкія, манастырскія і іншыя зборы. Захаванне рэчаў у культавых мэтах і ў якасці сведкаў мінулага. Скарбніца вялікіх князёў літоўскіх у Вільні.

Асаблівасці калекцыяніравання на Усходзе ў эпоху сярэднявечча.

### *Тэма 5. Узнікненне музея як сацыякультурнага інстытута. Музейная справа ў эпоху Адраджэння*

Гісторыка-культурныя перадумовы станаўлення эпохі Адраджэння. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця Еўропы: пераарыентацыя ганлёвых шляхоў, развіццё рамёстваў, гандлю, вялікія геаграфічныя адкрыцці, змены светапогляду, гуманізацыя культуры, узмацненне цікавасці да мінулага і гістарычнага вопыту чалавецтва.

Зараджэнне асобных спецыялізаваных калекцый і музеяў мастацкага, прыродазнаўчага, навукова-тэхнічнага і гістарычнага профіляў.

Адраджэнне прыватнага збіральніцтва ў эпоху Адраджэння як элемент рэнесансных адносін да гістарычнага мінулага. Мастацкія калекцыі дынастыі Медычы (Фларэнцыя), Ганзага (Мантуя), П. дэ Мантэфельтра (Урбіна). Мецэнацкая і калекцыянерская дзейнасць рымскіх пап у Рыме. Распаўсюджванне збіральніцтва на поўнач ад Альп. Збіральніцкая дзейнасць Вітэльсбахаў (Мюнхен), Габсбургаў (Вена, Прага, замак Амбрас.), Францыска І Валуа (Фантэбло), Т. Хаўэрда і іншых (Англія). Мастацкія зборы ў палацах Эскарыял і Алькасар.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Развіццё прыродазнаўчых і навукова-тэхнічных калекцый і музеяў. Ф. Кальчалары (Верона), М. Меркаці (Рым), Ф. Імперата (Неапаль) і інш. Стварэнне калекцый экзатычных мінералаў, раслін, жывёл. Анатамічныя музеі і тэатры.

Дзяржаўныя скарбніцы: Таўэр (Лондан), Вавельскі замак (Кракаў), Збройная палата (Масква) і інш.

З'яўленне першых даследаванняў у галіне музеязнаўства. Узнікненне першых музеяў і іх назвы. Фарміраванне музейнай тэрміналогіі. Змяненне сацыяльнага складу збіральнікаў і калекцыянераў. Прадстаўленне прадметаў у калекцыях. Даступнасць тагачасных калекцый для публікі.

Прыватныя калекцыі магнацкіх родаў у Беларусі. Закрытыя зборы Радзівілаў, Сапегаў і іншых.

***Тэма 6. Фарміраванне музея як сацыяльнага інстытута ў эпоху Асветы***

Палітыка «асветнага абсалютызму» і яго ўплыў на культурныя працэсы. Пашырэнне кругагляду чалавека з дасягненнем поспехаў у прыродазнаўстве, развіцці навукі і навукова-тэхнічнай рэвалюцыі XVIII ст. Абсалютызацыя ролі навукі. Новая класіфікацыя ведаў. З'яўленне навуковых таварыстваў, адкрыццё акадэмій навук, універсітэтаў і іх уплыў на развіццё культуры і музея як яе феномена. Роля энцыклапедыстаў у развіцці музейнай справы.

Папулярызацыя дасягненняў навукі і твораў мастацтва ў музеях як увасабленне асветніцкіх ідэй. Пашырэнне прыватнага калекцыяніравання. Змены сацыяльных функцый збіральніцтва. Шматпрофільнасць і ўніверсальнасць прыватных збораў. Разнастайнасць тыпаў музеяў і музейных збораў у Еўропе: кунсткамеры, пінакатэкі, арсеналы (цэйхгаўзы) і інш.

Фарміраванне палацавых калекцый мастацтва: Луўр (Парыж), Цвінгер (Дрэздэн), Імператарская галерэя (Вена), Эрмітажа (Санк-Пецярбург) і інш. Прыватныя калекцыі твораў мастацтва (А. Рэшылье, Дж. Мазарыні, Карл I і інш.). Узнікненне мастацкіх выставак. «Салоны» Д. Дзідро.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адкрыццё першых публічных прыродазнаўчых музеяў у Еўропе: Кунтскамера (Санкт-Пецярбург, 1714), Брытанскі музей (Лондан, 1753). Асаблівасці збораў натуральнага характару і іх уплыў на развіццё прыродазнаўчых навук. Прыватныя зборы натуральнага характару (бацькі і сына Трэйдэскэнтаў, У. Ворма, А. Себа, Э. Левера і інш.).

Навукова-тэхнічныя музеі і калекцыі (А. Кірхера, Ж. Вакансона, Т. ван дэр Хульста і інш.). Асаблівасці зместу іх калекцый. Роля навуковых таварыстваў і ўніверсітэтаў у стварэнні падобных музеяў.

Музеі гістарычнага профілю. Новыя формы прадстаўлення гістарычных ведаў музейнымі сродкамі (панарамы, паноптыкумы).

Развіццё музейнай справы ва Усходняй Еўропе. Музейная справа ў Беларусі ў эпоху Асветы. Прыватныя мастацкія калекцыі ў Беларусі. З'яўленне музеяў пры навучальных установах (Полацкім езуіцкім калегіуме, Гродзенскай медыцынскай школе). Элементы вайсковых калекцый у магнацкіх зборах (Нясвіж, Дзярэчын). Новыя тэндэнцыі ў прыватным збіральніцтве. Мастацкія галерэі І. Храптовіча, І. Масальскага і інш. Прыватныя зборы натуральнага характару. Роля збіральнікаў Беларусі ў развіцці мастацтва, прыродазнаўства, дакладных навук.

### *Тэма 7. Пераўтварэнне музеяў у публічныя ўстановы. Музейная справа ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.*

Агульныя тэндэнцыі развіцця грамадства. Рамантызм як культурны напрамак, яго ўплыў на фарміраванне новага светапогляду. Працэс дэмакратызацыі музейных устаноў пад уплывам ідэй буржуазных рэвалюцый. З'яўленне шэрагу нацыянальных музеяў у краінах Заходняй Еўропы і Амерыкі. Стварэнне музеяў у краінах Усходняй Еўропы як вынік росту нацыянальнай свядомасці.

Мастацкія музеі і іх развіццё. Стварэнне мастацкіх музеяў у Еўропе, Расійскай імперыі, на Амерыканскім кантыненце, у Афрыцы. Імклівы росквіт мастацтвазнаўства. Адкрыццё новых мастацкіх музеяў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спецыялізацыя музеяў прыродазнаўча-навуковага профілю.

Развіццё навукова-тэхнічных музеяў. Роля Ж. Вакансона ў папулярызацыі ведаў у галіне навукі і тэхнікі. Нацыянальная кансерваторыя мастацтваў і рамёстваў (Парыж, 1794). Навукова-тэхнічныя музеі Вялікабрытаніі. Прамысловыя і сельскагаспадарчыя выстаўкі ў Еўропе і Расійскай імперыі і іх уплыў на фарміраванне музейных калекцый.

Развіццё гістарычных музеяў. Стварэнне ваенна-гістарычных музеяў і музеяў нацыянальнай славы.

Новыя формы папулярызацыі ведаў пра грамадства і прыроду: панарамы, Амерыканскі музей Ф. Барнума, паноптыкум М. Цюсо. «Акадэмічны рад» (Gallerea progressiva). Адыход ад выключнай зацікаўленасці ў культурнай спадчыне Антычнасці. З'яўленне зацікаўленасці да мясцовых старажытнасцей. К. Томсэн і Музей паўночных старажытнасцей у Капенгагене (1819). Узнікненне руху за ахову і рэстаўрацыю нерухомай гісторыка-культурнай спадчыны.

Рэарганізацыя Эрмітажа і Збройнай палаты. Распрацоўка праектаў стварэння нацыянальнага музея ў Расійскай імперыі (Праекты Ф. Адэлунга, Б. Віхмана, Т. Зана, З. Валконскай, П. П. Свіньіна і інш.). Дзейнасць мецэнатаў і навуковых таварыстваў. Навуковыя экспедыцыі і стварэнне этнаграфічных музеяў і калекцый. І. Ф. Крузэнштэрн, Ф. П. Літке, М. М. Пржэвальскі, М. М. Міклуха-Маклай і іх роля ў стварэнні музейных калекцый. Навуковыя экспедыцыі ў Егіпце, на Блізкі Ўсход, у Грэцыю.

Пашырэнне прыватнага збіральніцтва ў Беларусі. Узнікненне крыніцазнаўчага падыходу ў збіральніцтве. Я. П. і К. П. Тышкевічы, А. Плятэр, А. Гюнтэр, Т. Нарбут, М. П. Румянцаў і інш. Прыватныя і вучэбныя прыродазнаўчыя калекцыі і кабінеты. Стварэнне прыватных мастацкіх калекцый і калекцый нацыянальнага мастатцва. Калекцыі К. Тызенгаўза, М. Тышкевіча, В. Пуслоўскага, І. Сабальшчыкова і інш. Прыродазнаўчыя прыватныя калекцыі. Стварэнне і дзейнасць сельскагаспадарчых выстаў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музеяў. Вучэбныя музеі пры сярэдніх і вышэйшых навучальных установах (Віленскім універсітэце, Горы-Горацкім земляробчым інстытуце, гімназіях).

### *Тэма 8. Спецыялізацыя музеяў.*
### *Музейная справа ў другой палове XIX – пачатку XX ст.*

Уплыў адкрыццяў, развіцця гандлю і камерцыі, транспарту на стан музейнай справы. Развіццё спецыялізаваных музеяў: мастацкіх (у іх ліку прыкладнога і сучаснага мастацтва), прыродазнаўча-навуковых, навукова-тэхнічных, гістарычных (у тым ліку ваенна-гістарычных, этнаграфічных, царкоўна-гістарычных). Тэхнічная рэвалюцыя. Прамысловыя выстаўкі і іх уплыў на адкрыццё адпаведных музеяў. Паўднёва-Кенсінгстонскі музей у Лондане (1852), Аўстрыйскі мастацка-прамыслова музей у Вене (1864), Нямецкі музей рамёстваў у Мюнхене (1903) і інш.

Роля мецэнацтва, прыватнага калекцыяніравання, антыквараў і гандляроў мастацкімі каштоўнасцямі ў развіцці мастацкіх музеяў. Імклівае папаўненне збораў «старых» еўрапейскіх» музеяў і пераўтварэнне іх ва ўстановы энцыклапедычнага характару (Луўр, Брытанскі музей, Эрмітаж). Буйнейшыя новыя мастацкія музеі (Метраполітэн-музей у Нью-Ёрку, Востраў музеяў у Берліне, Палац прыроды і Палац мастацтваў у Вене, Тэйт-галерэя ў Лондане, Смітсонаўскі музей у Вашынгтоне і інш.).

Фарміраванне спецыялізаваных гістарычных дысцыплін і ўзнікненне новых спецыялізаваных музеяў гістарычнага профілю. Новуковыя гістарычныя таварыствы і іх уплыў на дзейнасць музеяў.

Краязнаўчы і радзімазнаўчы рух у Еўропе. Рост цікавасці да мясцовай гісторыі. Масавае ўзнікненне музеяў мясцовага краю. Стварэнне гістарычных музеяў у шматнацыянальных дзяржавах.

Павышэнне цікавасці да народнай культуры і захавання помнікаў. Рух за стварэнне этнаграфічных музеяў. Сусветныя і першыя этнаграфічныя выстаўкі і іх роля ў стварэнні этнаграфічных музеяў. Стварэнне музеяў пад адкрытым небам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Росквіт музейнай справы ў Расійскай імперыі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Таварыства перасоўных выставак. Роля дзяржаўных органаў, прыватнай ініцыятывы (мецэнатаў і калекцыянераў) у пашырэнні музейнай сеткі імперыі. Дзяржаўны гістарычны музей, галерэя братоў С. М. і П. М. Траццяковых, Музей прыгожых мастацтваў І. У. Цвятаева, Політэхнічны музей у Маскве, Рускі музей імя Аляксандра III і інш. Узнікненне першых літаратурна-мемарыяльных музеяў.

Фарміраванне сучанай структуры музеяў: вылучэнне фондаў і экспазіцыі. Інавацыі ў экспазіцыйным рашэнні музеяў (скансэны, мемарыялы, батальныя панарамы). Станаўленне і спецыялізацыя музейнай прафесіі (захавальнікі, рэстаўратары, папулярызатары калекцый). Фарміраванне музейнай грамадскасці. Пачатак музеязнаўчай адукацыі. Музеязнаўчыя выданні.

Уздым музейнага руху ў Беларусі. Асноўныя фактары павелічэння колькасці музеяў у Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Дэмакратызацыя грамадскага жыцця, уздым нацыянальнага руху, дзейнасць навуковых і царкоўна-археалагічных таварыстваў, архіўных і археалагічных камісій і іншых устаноў па стварэнні музеяў. Роля беларускай інтэлігенцыі ў стварэнніі Віленскага музея старажытнасцей.

Царкоўна-археалагічныя музеі і іх роля ў захаванні і вывучэнні гісторыка-культурнай спадчыны. Павелічэнне колькасці вучэбных музеяў пры сярэдніх навучальных установах Беларусі. Музеі навучальных дапаможнікаў. Стварэнне на тэрыторыі Беларусі музеяў і выставак эканоміка-тэхнічнага профілю. Прамысловыя выстаўкі, музеі пры палатах дзяржаўных маёмасцей, статыстычных камітэтах, земствах.

Росквіт прыватнага збіральніцтва ў Беларусі. Мастацкія зборы. Спецыялізацыя сярод збіральнікаў калекцый гістарычнага профілю. Стварэнне выключна археалагічных, нумізматычных, ваенна-гістарычных, археаграфічных і іншых калекцый. Дзейнасць збіральнікаў-натуралістаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 9. Асноўныя тэндэнцыі развіцця музейнай справы ў краінах Заходняй Еўропы і Амерыкі паміж дзвюма сусветнымі войнамі*

Асаблівасці развіцця музейнай справы ў ліберальна-дэмакратычных краінах Заходняй Еўропы і ў ЗША. Павелічэнне колькасці музеяў розных профіляў. Наладжванне міжнароднага супрацоўніцтва ў межах Лігі нацый. Дзейнасць Міжнароднага бюро музеяў (1926-1946 гг.). Пашырэнне прафесійнай музеязнаўчай літаратуры і перыядычных выданняў.

Развіццё мастацкіх музеяў. Рост колькасць музеяў сучаснага і прыкладнога мастацтва. Нацыянальны музей сучаснага мастацтва ў Парыжы (1937).

Амерыканская мадэль развіцця музейнай справы з перавагай адукацыйных мэт. Буйнейшыя музейныя праекты, рэалізаваныя ў ЗША: Музей сучаснага мастацтва ў Нью-Ёрку (1929), музей Г. Форда ў Грынфілд Вілідж (1929), «Каланіяльны Ўльямсбург» (1934), Музей С. Гугенхейма ў Нью-Ёрку (1939), Нацыянальная галерэя ў Вашынгтоне (1941). Першыя вопыты сацыялагічнага вывучэння музейнай аўдыторыі.

Гістарычныя музеі (у тым ліку этнаграфічныя музеі). З’яўленне шэрагу музеяў пад адкрытым небам на амерыканскім кантыненце. Музей чалавека ў Францыі як процівага фашысцкай ідэалогіі, яго роля ў распаўсюджанні ідэй гуманізму, агульначалавечых каштоўнасцей.

Навукова-тэхнічныя і прыродазнаўчыя музеі.

Асаблівасці развіцця музеяў у таталітарных і аўтарытарных краінах Еўропы. Ідэалагізацыя і палітызацыя музейнай справы. Залежнасць музейнай справы ад ідэалагічных установак. Музей Рымскай імперыі (1926), музей Б. Мусаліні ў Рыме (1938). Дзейнасць музеяў мясцовага краю нацысцкай Германіі па выхаванні «сапраўдных немцаў». Перабудова дзейнасці нямецкіх ваенна-гістарычных музеяў. Рэпрэсіі супраць музейных супрацоўнікаў, чысткі ідэалагічна шкодных музейных калекцый.

### *Тэма 10. Музейная справа ў СССР у 1917 – 1941 г.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Уплыў рэвалюцыйных падзей 1917 г. на музеі і музейную справу. Станаўленне савецкай сістэмы музеяў. Першыя заканадаўчыя акты савецкай улады ў галіне музейнай справы. Нацыяналізацыя, улік, рэгістрацыя культурных і навуковых каштоўнасцей. Стварэнне дзяржаўных органаў па кіраванні музеямі ў цэнтры і на месцах. Дзейнасць Усерасійскай калегіі па справах музеяў і ахове помнікаў мастацтва і даўніны.

Фарміраванне нацыянальнага музейнага фонду. Стварэнне сеткі музеяў новага тыпу. Пралетарскія музеі, музеі-ансамблі, гісторыка-рэвалюцыйныя і антырэлігійныя музеі. Музеі дзяржаўнага і мясцовага значэння. Музей і развіццё краязнаўчага руху.

Пошук новых форм навукова-асветніцкай работы. Прынцыпы музейнай работы ва ўмовах таталітарнага грамадства. Музей – цэнтр для арганізацыі калектыўнага мыслення мас.

Новая сетка савецкіх музеяў. Першы Усерасійскі музейны з’езд (Масква, 1930) і яго вынікі. Развіццё музеязнаўчай думкі. Выданне музеязнаўчых часопісаў. Стварэнне навукова-даследчых цэнтраў распрацоўка праблем краязнаўчай і музейнай работы.

Арганізацыя падрыхтоўкі музейных кадраў. Дзейнасць вышэйшых музейных курсаў. Музейная аспірантура. Рэпрэсіі ў адносінах музейных супрацоўнікаў і краязнаўцаў. Страты ў музейнай справе. Продаж каштоўных музейных прадметаў, фізічнае знішчэнне помнікаў гісторыі і культуры.

**Музейная справа ў Беларусі.** Стварэнне першых савецкіх музеяў. Пошукі новых арганізацыйных форм для вырашэння пытанняў аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Прыцягненне кадраў мастацкай і навуковай інтэлігенцыі да музейнага будаўніцтва.

Роля музеяў у вывучэнні гістарычнага мінулага і прыроды Беларусі. Выданне заканадаўчых актаў, якія рэгулявалі стварэнне і дзейнасць музеяў. Распрацоўка праграмы развіцця музейнай справы.

Стабілізацыя музейнай сеткі ў 1923–29-х гг. Беларускі дзяржаўны музей і яго філіялы. Стварэнне музеяў у сістэме Інбелкульта і іншых ведамстваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Узнікненне музеяў, прысвечаных палітычнай гісторыі. Пастанова СНК БССР аб музейным будаўніцтве (1928).

Роля мясцовай інтэлігенцыі ў стварэнні сеткі краязнаўчых музеяў. Крязнаўчыя музеі ў Слуцку, Полацку, Барысаве і іншых акруговых і раённых цэнтрах Беларусі. Роля краязнаўчага часопіса «Наш край» у распрацоўцы музейнай праблематыкі. Пытанні музейнага будаўніцтва на краязнаўчых канферэнцыях і з’ездах.

Паступовая ўніфікацыя музейнай справы. Нарада музейных супрацоўнікаў Беларусі (1932). Звужэнне задач музейнай дзейнасці да задач палітасветы. Пераўтварэнне экспазіцый у ілюстрацыйны ідэалагічны матэрыял. Знішчэнне музеяў і вываз помнікаў гісторыі і мастацтва за межы Беларусі. Барацьба з «рэчавым фетышызмам».

